**І. С. ЦІБЕЦ,**
настаўніца Лагішынскай сярэдняй школы Пінскага раёна

# Літаратурна-краязнаўчая вандроўка «ПАЛЕСКІ ШЛЯХ ЯКУБА КОЛАСА» для вучняў ІХ—ХІ класаў

Мэта: паглыбіць веды вучняў пра жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа, бліжэй пазнаёміць з мясцінамі, якія сталі крыніцай натхнення і вытокамі творчасці песняра, стварыць умовы для развіцця цікавасці вучняў да гістарычнага мінулага, выхоўваць павагу да выдатных асоб нацыянальнай літаратуры.

Афармленне залы: сцэна ўпрыгожана партрэтам Якуба Коласа, на століку ў вазе стаяць кветкі і каласкі. На сцэне злева — стэнд з ілюстрацыямі вучняў да твораў Якуба Коласа, арганізавана кніжная выстава «Паклон Вам, беларускай зямлі Пясняр».

Сцэну можна аформіць і выказваннямі вядомых пісьменнікаў:

Якуб Колас — адзін з заснавальнікаў беларускай літаратуры і стваральнікаў беларускай літаратурнай мовы, настаўнік некалькіх пакаленняў сучасных беларускіх пісьменнікаў *(Максім Лужанін).*

Мой родны кут, якога сына,
Якога друга страціў ты!
Маўчаць палі у кроплях буйных рос,
Маўчаць бары, а сэрца плача ўголас,
Мой родны кут, упаў буйнейшы колас,
Што на тваёй зямлі узрос.

*Сяргей Грахоўскі. «Песня будзе жыць».*

## Ход мерапрыемства

*Гучыць ціхая мелодыя. Выходзяць вядучыя ў беларускіх народных строях. На экране пры адпаведных словах вядучых дэманструюцца слайды прэзентацыі.*

Першы вядучы.

Жыта хвалюецца, сэрца на ўздыме,
Сэрца чакала такога даўно.
Слаўлю таго, хто абраў сваім імем
Колас, напоўнены спелым зярном.

Другі вядучы.

Два каласы, дзве праўдзівыя песні
Побач ідуць, нібы сонца у свет.
Колькі вы радасці людзям прынеслі,
Колас жытнёвы і Колас-паэт!

*Раман Тармола-Мірскі.*

Першы вядучы. Добры дзень, паважаныя сябры!

Другі вядучы. Вітаем усіх, хто прыйшоў на наша мерапрыемства, прысвечанае Якубу Коласу, класіку беларускай літаратуры, уладару беларускага слова.

Настаўнік. Ён «аддаў увесь свой талент народу, у гэтым яго харaство і веліч. Паэт, празаік, драматург, вучоны, публіцыст — няма, здаецца, у беларускай літаратуры такога жанру, няма ў яе гісторыі на працягу паўстагоддзя такой старонкі, дзе б ні заззяла слаўнае імя Якуба Коласа, не праявілася б якая-небудзь грань яго шчодрага таленту», — так пісаў Іван Мележ. І сапраўды, дзядзька Антось, Міхал і Ганна, Сымон-музыка, настаўнік Андрэй Лабановіч — хіба можна сёння гаварыць пра нашу літаратуру, не называючы імёнаў гэтых герояў? А між тым намаляваны яны дзякуючы таленту непераўзыдзенага майстра слова — Якуба Коласа.

Народны паэт даўно пайшоў з жыцця. Але памяць пра яго жыве і шануецца ў нашай Беларусі. Мы ведаем і ганарымся тым, што ён працаваў на Піншчыне. Сёння ў нас ёсць мажлівасць даведацца пра жыццё і творчую дзейнасць Якуба Коласа на Палессі. Давайце ж пройдзем палескімі сцежкамі аднаго з выдатных сыноў беларускага народа.

Першы вядучы. Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) нарадзіўся 3 лістапада 1882 года ва ўрочышчы Акінчыцы Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і лесніка. Калыскай яму былі родныя палі і дубровы, калыханкай — народныя песні і лясны гоман. З даўніх часоў Акінчыцы славіліся маляўнічымі краявідамі, квяцістымі духмянымі лугамі. А цяпер гэты край увайшоў у гісторыю як родны кут Якуба Коласа.

*Гучыць песня «Мой родны кут» (муз. І. Лучанка), на экране дэманструюцца хата і мясціны, дзе нарадзіўся беларускі паэт.*

Другі вядучы. Гадаваўся Косцік змалку ўражлівым, цікаўным, дапытлівым хлопчыкам. Любіў легчы на спіну, узірацца ў нябесны блакіт... Плывуць вунь у вышыні рэдзенькія белыя воблачкі. Чаму яны плывуць? Хто іх падганяе? Хочацца хлопчыку ведаць, чаму вечарам загараюцца на небе ліхтарыкі-зоркі... Хто іх запальвае? Чаму ўдзень іх не відаць?.. Не раз Косцік любаваўся, як бусляняты кружыліся над лесам і сенажаццю... Яшчэ цікавей было наглядаць, як вучыліся лётаць бусляняты...

Першы вядучы. Чулая душа хлапчука прагна ўбірала жывыя галасы зямлі, пераплаўляючы шолахі і гукі ў радкі першых вучнёўскіх вершаў. Свой першы верш «Вясна» Кастусь Міцкевіч напісаў у дванаццаць год.

Другі вядучы. А ў пятнаццаць гадоў хлопец паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, якую закончыў у 1902 годзе.

Першы вядучы. Восенню 1902 года Канстанцін Міхайлавіч едзе ў Люсіна Пінскага павета працаваць настаўнікам. Вёска, у якой налічвалася 50 двароў, знаходзілася паблізу ракі Цны, з усіх бакоў яе абступалі балоты ды лес. Па тым часе гэта была дзікая, глухая мясціна.

Першы чытальнік. «Невялічкая вёска ў адну вуліцу выглядала непрыветна і непрытульна... амаль што не каля кожнай хаты ляжалі кучы бярвення і гнілі, але нікому не прыходзіла ў галаву палажыць кладачку хоць супроць свае хаты, каб льга было прайсці праз балота, у якім тапілася гэта вуліца... але палешукі звыкліся і зжыліся з гэтай граззю і не зварачалі на яе ўвагі. Хаты былі пераважна новыя, пабудаваныя з тоўстага і гладкага лесу. У размяшчэнні гаспадарскіх будынін на двары таксама не было пэўнага парадку і сістэмы, а ўсё было навалена як папала», — пісаў Якуб Колас пра вёску Цельшына ў трылогіі «На ростанях». Цельшына — гэта тое ж Люсіна.

Другі вядучы. Канстанціна Міхайлавіча цягнула да мясцовых жыхароў, ён часта гутарыў з імі, раіўся, спачуваў ім. Палешукі хутка прызналі ў маладым настаўніку «свайго», чалавека з сялянскага асяродку. Яны заходзілі да яго на кватэру са сваімі скаргамі, крыўдамі, бедамі. Канстанцін Міхайлавіч клапаціўся пра добраўпарадкаванне школы, дапамагаў бедным і сіротам, арганізоўваў лекцыі для вяскоўцаў, растлумачваў ім неабходнасць адукацыі.

Першы вядучы. Люсінскае народнае вучылішча наведвалі тады 35 хлопчыкаў і дзве дзяўчынкі. З успамінаў былых вучняў вядома, што ў школе ў той час вывучалі арыфметыку, пісьмо, чытанне, спевы, чыстапісанне і закон Божы. Вялікіх намаганняў каштавала Міцкевічу пераканаць палешукоў насуперак іх закаранелым традыцыям у тым, што ў школу павінны хадзіць не толькі хлопчыкі, але і дзяўчынкі. Усю душу аддаваў ён школе, праяўляў патрабавальнасць не толькі да вучняў, але і да сябе, усімі сіламі імкнуўся прывіць дзецям любоў да школы, да роднага краю, да роднай мовы.

**Другі вядучы.** Канстанцін Міхайлавіч быў простым і задушэўным у абыходжанні з сялянамі. Колішні яго вучань Міхаіл Занько вось што расказваў.

**Другі чытальнік.** «Шмат гадоў таму назад у Люсіна прыехаў малады настаўнік Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. Нялёгка было пачынаць работу ў вёсцы, дзе нават аб газавай лямпе маглі толькі марыць. Нястомна пераконваў малады настаўнік, што сялянам, як святло, патрэбна грамата. Настаўніка палюбілі ўсе: і старыя, і дзеці.

Бывала, збярэ ён нас і пачне распытваць, якія песні ў нас пяюць, якія гульні бываюць у святы. Усё: і легенды аб татарскім нашэсці, і народныя звычаі, і абрады — цікавіла педагога. Але больш за ўсё яго хваляваў лёс народа».

**Першы вядучы.** І ў гутарках з дарослымі, і на ўроках у класе настаўнік імкнуўся развіваць і выхоўваць у дзяцей лепшыя якасці. А яшчэ ён пачаў разумець, што прычына народнай нядолі ў несправядлівасці грамадскіх адносін, якія ўсталявала царская ўлада.

**Другі вядучы.** У Люсіне Міцкевіч пазнаёміўся з рэвалюцыйнай літаратурай, якую даваў настаўніку адзін сталяр-яўрэй, яго недалёкі зямляк са Стоўбцаў. «Гэтыя брашуркі, — пісаў Якуб Колас у аўтабіяграфіі, — далі ход маім разважанням у зусім новым напрамку і моцна зацікавілі мяне. Яны зрабілі ва мне цэлы пераварот». У рэвалюцыйнай літаратуры ён знайшоў адказ на хвалюючыя пытанні жыцця, пераканаўся, што «рэальная сіла толькі і можа быць тады, калі будзе моцная арганізацыя і калі работа павядзецца па строга адзначанаму плану». І малады настаўнік шукаў тых шляхоў, якімі абяздолены беларускі люд мог бы прыйсці да свабоды і шчасця.



Яшукова гара.

**Першы вядучы.** У вёсцы было некалькі ўлюбёных і дарагіх Канстанціну Міхайлавічу мясцін, дзе ён хадзіў, адпачываў, марыў. Яшуковай гары Колас прысвяціў свой твор. На жаль, тэкст яго не захаваўся. У трылогіі «На ростанях» ёсць легенда пра Яшукову гару.

**Другі вядучы.** Па вечарах настаўнік працаваў над вялікім празаічным творам на рускай мове «Адзін з сотні». Гэты твор акурат і паклаў пачатак трылогіі «На ростанях».

**Першы вядучы.** Пасля школьных экзаменаў Канстанцін Міхайлавіч напісаў прашэнне аб пераводзе з Люсіна ў іншую школу.

**Другі вядучы.** Летні адпачынак заканчваўся. Канстанцін Міхайлавіч атрымаў паведамленне аб прызначэнні ў Пінкавіцкую школу, пра якую раней не чуў.

**Першы вядучы.** Ён пайшоў да свайго сябра ў Мікалаеўшчынскую школу, каб падзяліцца навіной, знайсці гэтае месца на карце. Але вёску Пінкавічы адшукалі толькі ў «Памятнай кнізе Мінскай губерні», — на карце яе не было.

**Другі вядучы.** Вераснёўскай раніцай 1904 года, развітаўшыся з маці і сёстрамі, сябрамі і роднымі мясцінамі, Канстанцін Міхайлавіч рушыў на станцыю, адкуль цягнік памчаў яго ў глыбіню Палесся.

**Першы вядучы.** Пінкавічы, вёска над ракой Пінай, за тры вярсты ад Пінска, на той час налічвалі 35 двароў. Навокал маляўнічыя палі, лугі, лясы. Сяляне займаліся тут сплавам лесу і рыбалоўствам. Вёску Канстанцін Міхайлавіч палюбіў усёй душой. Тут і школа лепшая за Люсінскую, і сялянскія хаты мелі акуратнейшы выгляд. Міцкевіч прыехаў сюды з малодшымі братамі Міхасём і Іосіфам.

**Другі вядучы.** «Пінкавічы і Вішавічы — вёскі побач, цераз пляц. Школа стаяла паміж вёсак, — прыгадваў Іосіф Міхайлавіч. — Кватэра настаўніка была пры школе і мела тры пакоі».

**Першы вядучы.** Пінкавіцкае вучылішча наведвала 50 хлопчыкаў.

**Другі вядучы.** Настаўнік шукаў новыя прыёмы працы ў школе. Разам з тым ён яшчэ лепш зразумеў прычыны сацыяльнай несправядлівасці, грамадскіх парадкаў, пры якіх беларусы былі бяспраўныя.

«У 1905 годзе, — пісаў Якуб Колас, — я быў ужо заўзятым ворагам самадзяржаўя і ў гэтым кірунку вёў работу».

**Першы вядучы.** Жыхар вёскі Пінкавічы Фама Пятровіч Бязручка прыгадваў. Паслухайце, калі ласка.

**Трэці чытальнік.** «Канстанцін Міхайлавіч быў рэдкі чалавек. У той час інтэлігентныя людзі цураліся простага люду. А ён зусім не падобны быў да іх. Ён любіў гутарыць з намі, мужыкамі. За гэта, напэўна, яму і пападала ад начальства, ды і паліцыя за ім штосьці вельмі сачыла.

Па вечарах часта збіраў ён сялян у школу, асабліва хлопцаў і дзяўчат, і пад выглядам царкоўнага хору праводзіў палітычную работу».

**Другі вядучы.** Пінкавіцкі перыяд даў Якубу Коласу каштоўны матэрыял для напісання аповесці «У глыбі Палесся», а тыя сяляне, што прыходзілі да яго ў школу, сталі прататыпамі літаратурных герояў.



Кніга «У глыбі Палесся».

**Першы вядучы.** Фама Пятровіч успамінаў, што Канстанцін Міхайлавіч дапамог жыхарам скласці петыцыю, у якой патрабавалі ад пана Скірмунта даць ім права карыстацца азёрамі, лавіць рыбу ў памешчыцкіх вадаёмах і збіраць чарот. Пад гэтай петыцыяй распісаліся вяскоўцы.

**Другі вядучы.** Архіўныя дакументы сведчаць, што за дзейнасцю маладога настаўніка пільна сачыла царская паліцыя. Дванаццатага снежня 1905 года мінскі генерал-губернатар Курлоў паведамляў спраўніку Пінскага павета...

**Чацвёрты чытальнік.** «З прычыны наяўных у мяне звестак аб падбухторванні настаўнікам с. Пінкавіч Міцкевічам сялян таго ж сяла супраць памешчыкаў да прад'яўлення імі незаконных патрабаванняў, а пры незадавальненні іх — гвалтоўнага захопу маёмасці прадпісваю... старанна праверыць указаныя звесткі і ў выпадку іх пацвярджэння неадкладна арыштаваць названую асобу...»

**Першы вядучы.** Трынаццатага снежня 1905 года генерал-губернатар Курлоў паслаў дырэктару народных вучылішчаў Мінскай губерні дырэктыву. У ёй гаварылася наступнае.

**Чацвёрты чытальнік.** «Дасылаю... копію заявы сялян сяла Пінкавіч, якія прад'явілі да памешчыка Скірмунта рад незаконных патрабаванняў, маючых мэтай паляпшэнне сялянскага быту... Паводле наяўных у мяне звестак, ініцыятарам гэтай заявы, а таксама і падбухторшчыкам насельніцтва з'яўляецца настаўнік с. Пінкавіч Міцкевіч».

**Другі вядучы.** За рэвалюцыйную прапаганду сярод сялян Канстанціна Міхайлавіча «ў парадку пакарання» перавялі ў Верхменскае народнае вучылішча Ігуменскага павета.

**Першы вядучы.** Гады працы на Палессі стварылі той запас жыццёвых уражанняў, які затым лёг у аснову многіх твораў пісьменніка. На ўсё жыццё ў памяці Канстанціна Міхайлавіча засталіся вобразы палескага краю, яго сціплых працаўнікоў. У 1952 годзе Якуб Колас пісаў...

**Пяты чытальнік.** «Амаль паўвека мінула з тых дзён, калі я, тады яшчэ юнак, прыехаў у вашу вёску, у школу. Перада мною і сёння паўстаюць малюнкі пінкавіцкіх ваколіц, зарэчныя абшары балот, якія параслі чаротам, і жыццярадасны народ, хоць і бедны, прыціснуты панамі, царскімі чыноўнікамі і паліцыяй. Але ўсё гэта ўжо далёкае мінулае...»

**Другі вядучы.** За правядзенне нелегальнага настаўніцкага з'езда ў роднай Мікалаеўшчыне Канстанцін Міцкевіч трапіў у Мінскі астрог (1908). Праз тры гады — 15 верасня 1911 года — ён выйшаў на волю. Пачаўся новы навучальны год. Каб атрымаць месца настаўніка, неабходна было мець пасведчанне «о благонадёжности». Канстанцін Міцкевіч такога не меў: яму неаднаразова адмаўлялі ў выдачы. Дапамаглі сябры. Былы яго сябар па Нясвіжскай семінарыі В. Філіповіч запрасіў беспрацоўнага настаўніка да сябе ў Лунінец і аддаў яму частку сваіх прыватных урокаў. Так лёс зноў звёў Якуба Коласа з Палессем.

**Першы вядучы.** Жылося ў Лунінцы нялёгка: заробак быў невялікі, ненадзейны і зменлівы. Канстанцін Міхайлавіч працягваў клапаціцца аб атрыманні пасведчання «о благонадёжности» і ў маі 1912 года атрымаў яго разам з прызначэннем у Купяціцкую школу Пінскага раёна, за 12 кіламетраў ад Пінска.

Прыехаў туды Якуб Колас перад пачаткам навучальнага года. Але працаваць там яму не давялося: перавёўся ў Пінск у трэцяе прыходскае вучылішча. Пінск быў добра знаёмы Якуба Коласу. У трылогіі «На ростанях» (кніга другая «У глыбі Палесся», частка другая «На новым месцы», глава XXVII) мы чытаем...

Шосты чытальнік. «...Дзе Піна падаецца ў бок зарэчных балот, вельмі добра відаць паўднёвая часць Пінска. Велізарны белы манастыр, збудаваны езуітамі ў шаснаццатым веку, і манастырскі будынак, дзе даўней жылі манахі, а цяпер змяшчаецца духоўнае вучылішча, узнімаюцца над роўняддзю балот, становячы самы крайні паўднёвы рог Пінска.

Зацятаю грознасцю і панураю суровасцю вее ад гэтых старасвецкіх муроў, а манастыр мае выгляд непадкупнага вартаўніка аджытых рэлігійных традыцый старасветчыны. Як непарушная скала над морам, стаіць над балотамі гэты маўклівы волат, аглядаючы неасяжныя разлогі Пінскага Палесся на далёкія дзясяткі вёрст».

Другі вядучы. Пасяліўся Якуб Колас на кватэры ўрача Балевіча, па вуліцы Водаправоднай (цяпер вуліца Івана Чуклая, 63).

Паводле ўспамінаў сястры Якуба Коласа Марыі Міхайлаўны: «Калі Костусь працаваў у Пінску, то адну зіму і я жыла ў яго. Мне тады было 14 год. Брат кватараваў у доме доктара Балевіча на Водаправоднай вуліцы. Дом гаспадара быў вялікі, прасторны. І хаця сям'я Балевіча таксама была вялікая, але ў наём здавалася кватэра з трох пакояў: спальні, сталовай і кухні. Брат тады працаваў у гарадскім вучылішчы. Да нас часта прыходзілі настаўнікі і іншыя госці. Чыталі кнігі, многа спрачаліся паміж сабой... Брат меў добрую бібліятэку, але ўсё купляў новыя кнігі. Часта чытаў уголас».

Першы вядучы. У Пінску лёс падараваў Канстанціну Міцкевічу сустрэчу, знаёмства, каханне з адзінай жанчынай, якая на ўсё астатняе жыццё стала яго зоркай, натхненнем, спадзяваннем і шчасцем. Абставіны іх сустрэчы так і засталіся для ўсіх таямніцай. Нідзе і ніколі не пісаў пра гэта Колас. Толькі сціпла расказваў, як пісаў некалі ў асобную кніжачку вершы, прысвечаныя Марыі Дзмітрыеўне. Для Міцкевіча яна была самай дарагой і незабыўнай. Дзе б ні быў пясняр, яна заўсёды была ў яго памяці.

*Выходзіць чытальнік у вобразе Коласа, затым на сцэне з'яўляецца дзяўчына ў вобразе каханай пісьменніка. Ціха гучыць музыка з песні «Беларусачка» (муз. Ю. Семянякі, сл. А. Ставера).*

Чытальнік.

Ты без мяне, а я далёка.
Над стэпам звіс нябёсаў тын,
А снег стэповы слепіць вока,
І сумна мне, бо я адзін.

За час наш доўгі я нямала
Быў у разлуцы і журбе.
Рука мая не ўсё спісала
З таго, што думаў аб табе.

— Даруй жа мне! — скажу я толькі,
Схіліўшы нізка галаву. —
Забудзь пакуты, гора, болькі —
Табой я жыў, табой жыву.

І блізка ты, і ты далёка.
Над стэпам звіс нябёсаў тын.
Змярцвелы стэп не цешыць вока,
І сумна мне, бо я адзін.

*Музыка сціхае, Колас і дзяўчына ідуць са сцэны.*

Другі вядучы. У 1913 годзе Канстанцін Міцкевіч і Марыя Каменская пабраліся шлюбам у Праабражэнскай (цяпер Свята-Варварынская) царкве (вул. Савецкая, 34). У сям'і Міцкевічаў нарадзілася трое сыноў: Даніла (1914, Пінск), Юрась (1917, Перм), Міхась (1926, Мінск).

Першы вядучы. Прайшло шмат гадоў з таго часу, калі Якуб Колас настаўнічаў у Люсіне і Пінкавічах, а людзі не забывалі яго. Пісалі пісьмы, расказвалі пра тыя змены, што адбываліся ў палескай вёсцы пры савецкай уладзе. А ў 1948 годзе люсінцы звярнуліся да Канстанціна Міхайлавіча з просьбай дапамагчы пабудаваць новую школу.

Другі вядучы. Якуб Колас адказаў ім: «Мае дарагія сябры-прыяцелі, мае былыя вучні і суседзі-люсінцы... Я зраблю ўсё, што ад мяне залежыць, каб у вас на месцы старой драўлянай школы... была пабудавана новая, прасторная, светлая...»

Першы вядучы. І школу пабудавалі, спачатку сямігодку, потым дзесяцігодку. На будынку школы ў 1966 годзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка з надпісам: «У нашай в. Люсіна ў 1902—1904 гадах працаваў настаўнікам вялікі пясняр беларускага народа Якуб Колас (К. М. Міцкевіч) і напісаў аповесць "У Палескай глушы" аб гэтай вёсцы». Да 100-годдзя з дня нараджэння паэта тут быў адкрыты літаратурна-этнаграфічны музей Якуба Коласа.

Другі вядучы. Школкі, дзе настаўнічаў Якуб Колас, ужо няма. На тым месцы — памятны комплекс. Драўляны зруб нагадвае аб школе, а ў цэнтры — валун з надпісам,

які паведамляе, што ў Люсіне з 1902 па 1904 год настаўнічаў народны паэт Беларусі Якуб Колас. Побач — драўляныя скульптуры палешукоў, герояў яго твораў.

Першы вядучы. Канстанцін Міхайлавіч не забываў сваіх сяброў-люсінцаў. Вось яго пісьмо да былога вучня М. В. Занько, напісанае праз некалькі гадоў пасля Вялікай Айчыннай вайны.

Сёмы чытальнік. «Дарагі Міхаіл Васільевіч! Атрымаў я, браток, тваё пісьмо. Я вельмі рад прыгадаць былое, свае маладыя гады, сваю першую школу, дзе я быў настаўнікам, і сваіх вучняў, у тым ліку і цябе, мой дарагі Міхалка. Многа гадоў прайшло з таго часу. Многа ўсякіх падзей і змен у жыцці адбылося за гэты час. Люсіна я ніколі не забуду. Я памятаю Люсінскую школу... усё думаў паехаць, пабываць на месцы і ўсё пабачыць сваімі ўласнымі вачамі. А цяпер для мяне такія паездкі не пад сілу... А цікава б было пабачыць хоць адно дрэўца, што калісь садзілі мы вакол Люсінскай школы. Перадай, браток, маё шчырае прывітанне ўсім, хто помніць мяне...»

Другі вядучы. Пінкавічы... Гэтыя прыгожыя мясціны некалі натхнялі вялікага песняра. Магутныя ліпы, бярозы, дубы — імі ў свой час любаваўся паэт. Вось невялікі гай. Тут стаіць будынак. «Гэта Коласава школа», — любоўна называюць яе жыхары Пінкавіч.

Школа мае даволі доўгую гісторыю — упершыню вучні прыйшлі ў яе сцены восенню 1863 года. У верасні 1939-га ў гэтым будынку адкрылася сямігодка, а ў 1952 годзе яна вырасла ў дзесяцігодку. Калі ж пабудавалі новую двухпавярховую школу, то ў Коласавай хаце размясціўся школьны інтэрнат.

Першы вядучы. Па хадайніцтве настаўнікаў Пінкавіцкай школы, супрацоўнікаў музея Якуба Коласа ў Мінску і Міністэрства асветы БССР будынак спецыяльна аднавілі для ўшанавання памяці народнага паэта. У 1961 годзе на ім была ўстаноўлена мемарыяльная дошка: «Тут з 1904 па 1906 год працаваў настаўнікам народны паэт Беларусі Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч)».

Другі вядучы. Цяпер у Пінкавічах вялікая трохпавярховая сярэдняя школа, якая носіць імя паэта. Навучанне ў ёй пачалося з верасня 1987 года. А на месцы старой — новы цагляны будынак. Тут цяпер Коласаўскі музей.

Настаўнік. Якуба Коласа, народнага паэта Беларусі, не стала ў 1956 годзе.

*Экран з партрэтам пісьменніка гасне, а пасля загараецца зноў. Гучыць ціхая мелодыя.*

Восьмы чытальнік.

Няма паэта, Коласа не будзе,
Яму зямля прытулак свой дала.
Ды наша памяць дзён тых не забудзе,
Калі тут школа мройліва гула.

Ён навучаў дабру, а не пакоры,
Вёў да святла вяскову дзетвару;
І абуджаў палескія прасторы,
Вітаў душою сонца і зару.

З палешукамі жыў адною доляй,
Свае парады людзям ён даваў.
Аб шчасці марыў пад ярмом няволі,
Тутэйшы люд надзеяй акрыляў.

*Алесь Бібіцкі.*

Настаўнік. Было жніво... Смерць зрэзала гэты найдаражэйшы Колас роднае зямлі. Уся Беларусь развітвалася з любімым пісьменнікам. Але і да сёння ён застаецца жывым: у сваіх творах, ва ўспамінах сяброў і сваякоў. Падзвіжніцкай была педагагічная праца Канстанціна Міцкевіча — маладога настаўніка і асветніка. Пераадольваючы цяжкасці, ён кідаў зярняты дабрыні і народнай праўды ў чулыя душы сялянскіх дзяцей, абуджаў у іх чалавечую годнасць, прадказваў ім вялікую будучыню. Дзеля гэтай будучыні ён працаваў у глухіх палескіх школах, уздымаў свой голас за навучанне на роднай мове...

Жыві, мілы Колас,
Многа летаў, зімаў
З ясным сонцам побач
На зямлі радзімай.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

Архіўныя дакументы літаратурна-этнаграфічнага музея Якуба Коласа ў в. Люсіна.

Архіўныя дакументы літаратурнага-краязнаўчага музея Якуба Коласа ў в. Пінкавічы.

Ганцавіцкі краязнаўча-інфармацыйны партал. — Рэжым доступу: *http://www.gants-region.info/index/0-93*. — Дата доступу: 15.09.15.

*Жыгоцкі, М. Р.* Прыйшоў у жыццё дзеля нас : нататкі пра лёс і творчасць Якуба Коласа / М. Р. Жыгоцкі. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2015. — 152 с.

*Жыгоцкі, М. Р.* Сэрца пакідаю вам: па коласаўскіх мясцінах / М. Р. Жыгоцкі. — Мінск : Полымя, 1993. — 80 с.

*Колас, Я.* На ростанях : трылогія / Якуб Колас. — Мінск : Маст. літ., 2007. — 660 с.